# ИСТОРИЯ



**НОВІКАЎ С.Я.***,
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт МДЛУ**

**Рэцэнзент КАВАЛЕНЯ А.А.,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт БДПУ імя Максіма Танка**

## "Александрыйскія мікрафільмы" як новая архіўная першакрыніца ваеннай гісторыі Беларусі

Абумоўленасць выкарыстання новых дакументаў як зыходных крыніц аб'ектыўнага, аргументаванага і адэкватнага гістарычнага доследу не падлягае аспрэчванню на падставе розных навуковых акалічнасцей, у тым ліку:

*па-першае,* трывалай залежнасці прагрэсу гістарычнай навукі ад узнікнення новых ведаў, якія з'яўляюцца вынікам працяглай, напружанай, апантанай працы даследчыка не столькі па пошуку, колькі па апрацоўцы знойдзеных дакументаў;

*па-другое,* абавязковага выяўлення ступені аб'ектыўнасці, адэкватнасці, дакладнасці выяўленых дакументальных першакрыніц, а таксама пэўнасці іх выкарыстання ў навуковым доследзе;

*па-трэцяе,* творчага вырашэння даследчыцкіх задач на аснове ўдасканалення методыкі навуковай працы, адыходу ад старых дагматычных і зацвярджэння новых поглядаў у айчыннай гістарычнай навуцы і інш.

Аўтарскі доследзед, які прапануецца ніжэй, скіраваны на першапачатковае знаёмства пакуль з малавядомай для айчынных даследчыкаў дакументальнай крыніцай з канкрэтнай назвай "александрыйскія мікрафільмы" ці проста александрыйская плёнка. У беларускай гістарыяграфіі на сённяшні дзень практычна няма навуковых распрацовак у дачыненні да згаданай дакументальнай крыніцы[1]. Такую сітуацыю нельга не заўважыць, асабліва калі

* Аўтар выказвае шчырую падзяку супрацоўніку Нацыянальнага архіва РБ Г.Р. Бялькевічу за дапамогу, дзякуючы якой падчас падрыхтоўкі матэрыялу да друку былі зроблены важныя ўдакладненні.

пагадзіцца з высновамі апантанага беларускага даследчыка ваеннай гісторыі А.М.Літвіна, які ўвёсну 1999 г.[**] гучна заявіў, што на зыходзе веку ці ўжо больш чым праз паўстагоддзе мы так і не здолелі адказаць на многія пытанні найскладанейшых, жудасных, пазачалавечых з аднаго боку, а з другога – геаічных, патрыятычных, самаахвярных выпрабаванняў *вайной* шматпакутнага беларускага народа. Як ні крыўдна айчынным гісторыкам успрымаць такі факт, але "да цяперашняга часу вялізная маса крыніц яшчэ не ўвайшла ў навуковы ўжытак… ёсць яшчэ цэлыя масівы, якія фактычна не закраналі даследчыкі"[2].

Датычыцца гэта ў значнай меры і "александрыйскіх мікрафільмаў[***] – мікракопій нямецкіх трафейных дакументаў, арыгіналы якіх захоўваліся ў г. Александрыя (ЗША)"[3]. Такое азначэнне дае, на першы погляд, некаторыя падставы для ўсведамлення вытокаў паходжання назвы дакумента. Аднак, каб мець больш поўную карціну, якая б бездакорна адпавядала ўсім акалічнасцям гісторыі ўзнікнення самога наймення, трэба звярнуць увагу на некаторыя аб'ектыўна існуючыя факты. Асабліва тыя, што могуць выклікаць самыя нечаканыя пытанні ў дасведчаных чытачоў. Напрыклад, сучасныя амерыканісты, якія грунтоўна вывучаюць ЗША, вымушаны будуць застацца хутчэй з пытаннем, чым адказам, паколькі так і не здолеюць канчаткова высвятліць для сябе: адносна якой з васьмі (!) геаграфічна зафіксаваных сёння амерыканскіх Александрый ідзе размова? Ці германісты, асабліва тыя, хто да гістарычных падзей 1989 г. займаўся ў асноўным вывучэннем ГДР як краіны практычнага выкарыстання нямецкай мовы, таксама могуць звярнуць увагу на існаванне архіўнай калекцыі "патсдамскіх", а не "александрыйскіх" мікрафільмаў. Дык ад якой з іх бярэ паходжанне назва вышэйзгаданай дакументальнай крыніцы?

На наш погляд, адказ трэба шукаць не на еўрапейскай, а на амерыканскай геаграфічнай прасторы, якая гістарычна звязана з назвай дакумента. Не толькі сваю назву, але і сваё паходжанне мікрафільмы бяруць хутчэй за ўсё ад Александрыі – прыгарада сучаснага Вашынгтона, куды пасля другой сусветнай вайны былі вывезены трафейныя нямецкія дакументы, што амаль адразу (пацверджаннем з'яўляюцца даты, якія сустракаюцца на плёнках пры іх тэхнічнай і архіўнай апрацоўцы, пра што крыху ніжэй) былі вывезены з Германіі ў Злучаныя Штаты. Там прадугледжвалася правядзенне грунтоўнай работы па апрацоўцы розных матэрыялаў, актаў, спраў Трэцяга Рэйха, асобных нямецкіх партыйных і германскіх дзяржаўных устаноў, асабістых фондаў рэйхсміністраў і г.д. Пра значнасць распачатай за акіянам навуковай працы сведчыць узровень, на якім прымаліся рашэнні аб тэматычнай сістэматызацыі, навуковай апрацоўцы

[**] Гл. падрабязней: Літвін А.М. Архіўныя дакументальныя крыніцы аб антыфашысцкай барацьбе на Беларусі // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. Мн., 1999. С. 33 – 52.

[***] Такую назву першым у айчыннай гістарыяграфіі вызначае С.У. Жумар, які закрануў праблему ў грунтоўным навуковым даследаванні "Документы по истории Великой Отечественной войны в государственных архивах Республики Беларусь. Аннотированный справочник", што ў 1998 г. пабачыў свет дзякуючы калектыву аўтараў-укладальнікаў у складзе: С.У. Жумара (адказны ўкладальнік), Л.М. Аляксандравай, В.А. Дабычынай, Н.А. Рэдказубавай, В.З. Селяменева.

і сервіснай падрыхтоўцы дакументаў. У ЗША гэтым непасрэдна займаліся Амерыканскі камітэт па вывучэнні дакументаў вайны, Нацыянальны архіў, Цэнтр архіўнага сервісу. Але галоўную ролю адыгралі члены Амерыканскай асацыяцыі гісторыкаў. Менавіта імі і была распрацавана структура саміх мікрафільмаў, форма тэхнічнай і навуковай апрацоўкі, уліку і інш.

Нельга не заўважыць, што сярод непасрэдных выканаўцаў і навуковых устаноў ці арганізацый, якія праводзілі аж да пачатку 1960-х гг. работу па перазняцці (мікракапіраванні) трафейных архіўных дакументаў, важнае месца займала служба архіўнага сервісу, дзякуючы якой у значнай меры адбывалася мэтанакіраванае тыражаванне арыгінальных крыніц. У выніку чаго трафейным нямецкім дакументам было наканавана вяртанне назад у Германію, першапачаткова ў дзве – у ФРГ і ГДР, а таксама ў іншыя еўрапейскія краіны, куды яны траплялі самымі рознымі шляхамі: набываліся на ўмовах аплаты, перадаваліся па абмену, пераздымаліся, разыходзіліся ў якасці навуковых ці дакументальных калекцый і г.д.

"Патсдамская" плёнка стала асновай для камплектавання фондавых калекцый мікрафільмаў у краінах былога СССР, у тым ліку БССР. Адзначым, што ў нашай краіне першыя дакументальныя матэрыялы прымаюць фонды Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі (былога ЦДАКР. – *С.Н.*) і Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Сюды мікрафільмы траплялі з Патсдама, куды трафейныя нямецкія (па тагачаснай прыналежнасці дакументаў, а не па іх паходжанні) дакументальныя крыніцы ў форме мікрафільмаў трапілі ў 60-я гг.[4] дзякуючы дзейнасці Патсдамскага архіўнага ўпраўлення пры Савеце міністраў ГДР.

Навуковае існаванне "патсдамскіх" мікрафільмаў мае месца ў сувязі з менавіта такім поглядам на іх паходжанне сучасных нямецкіх даследчыкаў, сярод якіх і аўтар адной з найноўшых навуковых крыніц, што ў кастрычніку 1999 г. пабачыла свет у вядомым выдавецтве Гамбурга (Hamburger Edition)[5]. На думку Хрысціяна Герлаха, аўтара "манументальнага даследавання" пра нямецкую эканамічную палітыку ў Беларусі (1941 – 1944), існуюць не "александрыйскія" а "патсдамскія" мікрафільмы[6]. Пра гэта нямецкі даследчык разважае падчас аналізу вялікай колькасці дакументальных крыніц, у тым ліку мікрафільмаў, знойдзеных ім у фондах Патсдама і Фрайбурга. Аднак па нейкіх прычынах аўтар абыходзіць назву "александрыйскія" мікрафільмы. Між тым, варта звярнуць увагу на тыя станоўчыя моманты, якія нямецкі гісторык выказвае ў дачыненні да мікрафільмавання архіўнай дакументацыі, а таксама яе навуковага выкарыстання даследчыкамі. Дзякуючы перазняццю архіўных дакументаў на мікрафільмы для навукоўцаў створаны добрыя ўмовы не толькі для аператыўнага пошуку, але і амаль імгненнага атрымання фарматаваных стандартам ліста адбіткаў патрэбных матэрыялаў. Такія перавагі для даследчыкаў ствараюць і тэхнічныя сродкі, без якіх сёння вельмі цяжка спрасціць навуковы пошук, скараціць час на гэту важную працу і значна павялічыць яго для больш эфектыўнага выкарыстання і апрацоўкі дакументальных крыніц. У нашым жа выпадку размова пакуль ідзе пра гісторыю назвы арыгінальнага архіўнага дакумента. Што лічыць гістарычным, больш доказным і менш бясспрэчным?

Падставай для вызначэння сутнасці самой назвы можа быць яшчэ адна крыніца, вядомая большасці беларускіх гісторыкаў пасля выхаду ў свет у 1993 г. масава-палітычнага выдання Ю.Б. Туронка "Беларусь пад нямецкай акупацыяй". У пераліку шматлікіх архіўных спасылак аўтар вельмі часта згадвае "т. зв. александрыйскія мікрафільмы"[7]. Адзначым адразу, што даследчык звяртаецца да такога арыгінальнага дакумента мажліва і па тэхнічных прычынах, якія вышэй ужо акрэсліў нямецкі калега. Аднак погляд на дакумент у польскага гісторыка прынцыпова адрозніваецца, паколькі на мікрафільмы калекцыі нямецкіх дакументаў апошні вымушаны спасылацца ў якасці пошуку дакументальных пацверджанняў. Пры гэтым Ю.Б. Туронак прыводзіць спасылку менавіта на "александрыйскія" мікрафільмы, якімі ён называе шэраг перазнятых пасля вайны дакументаў германскіх дзяржаўных устаноў, без якіх было немагчыма грунтоўна даследаваць розныя аспекты гісторыі Беларусі пад нямецкай акупацыяй. Па нашых падліках, у вышэйзгаданым выданні кожная пятая спасылка ўтрымлівае адрасныя матэрыялы "александрыйскіх" мікрафільмаў, што азначае: *з аднаго боку*, больш шырокае выкарыстанне арыгінальных першакрыніц, *а з другога* – аўтарскую спробу больш поўнага выкарыстання крыніц і пашырэння на іх аснове новых ведаў. І ўрэшце якраз такі навуковы дослед з'яўляецца абгрунтаваным пацверджаннем пошуку ўласных навуковых высноў. Не менш важным для беларускіх гісторыкаў можа быць і адрасная згадка пра амаль поўную калекцыю мікрафільмаў, якая захоўваецца ў Архіве новых актаў у Варшаве[8].

Калі звярнуцца да пакуль яшчэ не да канца высветленай поўна, але ўжо часткова праяснёнай гісторыі загадкавай плёнкі, дык трэба адзначыць, што яе "александрыйскае" паходжанне пацвярджаюць і некаторыя тэхнічныя моманты. Напрыклад, у якасці асновы для перазняцця калекцыі нямецкіх трафейных дакументаў была выкарыстана плёнка сусветна вядомай сёння амерыканскай фірмы Kodak. Таму атрымліваецца, што назва калекцыі мікрафільмаў мае менавіта амерыканскія, а не еўрапейскія карані. Хаця для архіваў БССР якраз Патсдам з'яўляўся цэнтрам распаўсюджання асобных мікракопій ці мікрафільмаў.

Такім чынам, адзін бок пастаўленай аўтарам праблемы ўжо часткова адлюстраваны на прыкладзе пошуку адказу аб паходжанні назвы "александрыйскіх" мікрафільмаў. Другі ж патрабуе археаграфічнага знаёмства з новым архіўным дакументам.

Археаграфічныя задачы артыкула можна вырашыць толькі праз больш падрабязнае апісанне мікрафільмаў, што практычна немагчыма ў межах навуковага артыкула, асабліва з улікам колькасных паказчыкаў, якія даюць даследчыкам агульнае ўяўленне пра наяўнасць перазнятага трафейнага матэрыялу. Пра месца "александрыйскіх" мікрафільмаў сярод іншых фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь *(далей НА РБ. – С.Н.)* могуць сведчыць агульныя характарыстыкі плёнкі. Калі за адзінку адліку прыняць звычайны ліст (аркуш) любой з архіўных спраў, дык на сёння калекцыя "александрыйскіх" мікрафільмаў складае 292 028 уліковых лістоў (кадраў)[9]. З такой колькасцю матэрыялаў кожнаму даследчыку патрэбна працаваць значны прамежак часу: нават калі ўмоўна

падзяліць гэтую лічбу на колькасць дзён невісакоснага года, дык атрымліваецца лічба ў 800 лістоў на дзень. Да таго ж адначым, што колькасць навукова апрацаваных на сённяшні дзень і адлюстраваных у архіўных крыніцах матэрыялаў зусім нязначная. Гэта вынікае з факта: пакуль што выбарачна перакладзены матэрыялы толькі 81 мікрафільма ці 30 % ад іх агульнай колькасці з улікам дадатковых ці дублікатных адбіткаў. У дачыненні да агульнага аб'ёму калекцыі мікрафільмаў неабходна адзначыць, што на сённяшні дзень айчыннаму даследчыку даступнымі сталі толькі крыху больш за 5 % матэрыялаў з "александрыйскай" плёнкі. Між тым на прадмет пошуку матэрыялаў, якія датычыліся толькі гісторыі Беларусі, апрацавана больш за 100 000 кадраў ці 34 % ад іх агульнай колькасці[10].

Цікавым з'яўляецца непасрэднае знаёмства ці апісанне мікрафільмаў. З улікам акрэсленай задачы паспрабуем разгледзець адну са стужак айчыннай калекцыі "александрыйскіх" мікрафільмаў на прадмет адлюстравання ў ёй матэрыялаў менавіта па гісторыі Беларусі. Пры гэтым нельга не адзначыць той факт, што з дня першапачатковага паступлення ў бягучы архіў сектара гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, затым у архіў ІГП пры ЦК КПБ і ў рэшце рэшт на момант паступлення мікрафільмаў у фонды НА РБ яны прайшлі першасную апрацоўку, у выніку чаго быў створаны шэраг асобных архіўных спраў, што сёння вядомы даследчыкам па фондзе пад нумарам 4683[****]. Сярод архіўных спраў аўтар спыняецца толькі на адной[*****], азнаямляльны вопіс якой утрымлівае інфармацыю адносна кароткага зместу архіўнага дакумента. З яго вынікае, што ў справе знайшлі адлюстраванне "Сообщения из занятых восточных областей № 1 – 55 начальника полиции безопасности и СД с 1.05.42 по 21.05.43". У той жа час ліст 154 гэтай жа справы ўтрымлівае і такую інфармацыю: "все остальные сообщения с № 42 по 55 содержатся в деле № 95". Але ж з некалькі наступных лістоў даведваемся пра "сообщения № 46, 50, 54, 55"[11].

Нават такое знаёмства дае падставы для таго, каб больш сур'ёзна звярнуць увагу на змест архіўнай справы. Асабліва патрэбны такі падыход маладым даследчыкам, якія пастаўлены перад складаным выбарам: адначасова ці паралельна весці пошук, адбор і праверку адэкватнасці архіўных матэрыялаў, паколькі апошнія могуць проста разыходзіцца са зместам сапраўднага <u>*гістарычнага дакумента*</u> *(выдзелена аўт. – **С.Н.**)*. Тут нельга не разгубіцца, асабліва калі мець на ўліку якраз такія арганізацыйныя моманты пошукавай работы. У якасці нагляднага прыкладу проста параўнаем толькі некаторыя матэрыялы архіўнай справы. Атрымліваецца, што з 55 ужо азначаных у анатацыі да справы "занятых восточных областей" толькі 17 адпавядаюць такой назве, у той час як астатнія 38 згаданы інакш, менавіта як "оккупированные восточные области". Пры гэтым у анатацыі да ўсёй справы адсутнічае згадка на такое разыходжанне, няма яе і на адпаведных лістах. На іх утрымліваецца і іншая інфармацыя, якая і далей здзіўляе даследчыка. Так, данясенні начальніка паліцыі і СД, г. зн. прадстаўніка афіцыйнай службы Рэйха, пад нумарамі 2, 9, 18, 20, 28, 33 і 38 маюць розныя, прычым супярэчлівыя,

---

[****] НА РБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр.: 913, 930, 931, 936, 937, 938, 948, 955, 973, 975, 981, 1004, 1018, 1019, 1047 і іншых, якія аўтар пакуль пакідае па-за навуковым доследам.
[*****] Тамсама. Спр. 948.

азначэнні. Адначасова *адны і тыя ж "сообщения"* *(выдзелена аўт. – С.Н.)* у адным выпадку згаданы як "занятых...", у другім – "оккупированных восточных областей"[12]. І гэта пры тым, што ў першакрыніцы (мікрафільме) у назвах службовых паведамленняў на працягу ўсяго часу нічога не змянялася апрача даты адпраўкі дакумента. Больш таго, "александрыйскія" мікрафільмы ўтрымліваюць наконт гэтага дадатковыя крыніцы, з якіх наглядна вынікае, што ў дачыненні да новых назваў усходніх абласцей існавалі дакладныя "распараджэнні", у межах выканання якіх на Усходзе дзейнічалі практычна ўсе службы Трэцяга Рэйха. З дырэктыўных указанняў вынікала, што для гітлераўскай Германіі ўсходнія тэрыторыі былі ці "освобожденные области", ці "вызваленыя ўсходнія абшары"[13]

Зыходзячы толькі з гэтага, падаецца зразумелым вострая патрэба ў звароце да першакрыніцы – любога мікрафільма з калекцыі НА РБ. Як бачна, некаторыя звесткі адносна мікрафільмаў можна сустрэць у згаданых вышэй архіўных справах. Напрыканцы кожнага дакумента, які адлюстраваны ў выглядзе перакладу, прыведзена кароткая легенда ці пошукавыя даныя з паведамленнем нумара мікрафільма, нумарацыі кадраў дакумента, даты апрацоўкі матэрыялу. Да таго ж з легенды вынікала і архіўная прывязка, праз якую арыгінальны дакумент зарэгістраваны, але не ў фондзе НА РБ, а – у Нацыянальным архіве ЗША, дзе мікрафільм меў асабісты нумар: T-175, Roll 235. Адзначым, падобны рэгістрацыйны нумар пакуль захоўваецца і на "александрыйскіх" мікрафільмах, якія складаюць айчынную калекцыю мікрафільмаў у фондах НА РБ. Патрэба ў такой адраснай прывязцы існуе па розных прычынах. *Па-першае*, па тэхнічных прычынах (нумар змешчаны на другім кадры плёнкі) немагчыма адмовіцца ад такой інфармацыі, *па-другое*, архіўны пошук патрэбнага мікрафільма значна паскараецца, калі згадваць не толькі новы ****** архіўны нумар мікрафільма, але і яго першапачатковыя шыфры. Гэта крыху абцяжарвае інфармацыйны модуль падачы заказаў на выдачу адзінак захоўвання, аднак дазваляе значна паскорыць пошук канкрэтнага мікрафільма з айчыннай калекцыі. Апрача таго, настаў час звярнуць увагу на форму падачы ў друку легенды ці спасылкі на выкарыстаны архіўны дакумент. У найноўшай навуковай літаратуры толькі ў апошні час сярод выкарыстаных крыніц пачалі сустракацца пошукавыя даныя[14] і на мікрафільмы. На наш погляд, перад архівазнаўцамі стаіць пытанне аб уніфікацыі зместу пошукавых даных у дачыненні да ўсёй калекцыі мікрафільмаў. З улікам агульных

****** Новыя нумары мікрафільмам былі нададзены толькі ў 1983 г. пасля перадачы калекцыі з бягучага архіва сектара гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў партыйны архіў Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Падчас камплектацыі калекцыі на працягу 1970-х гг. плёнкі захоўваліся пад двайнымі нумарамі, якія яны мелі першапачаткова як "александрыйскія" мікрафільмы, а таксама як матэрыялы патсдамскага архіва (адкуль паступалі плёнкі адабраных беларускімі навукоўцамі і супрацоўнікамі мікрафільмаў). Патрэба ў стварэнні новай архіўнай нумарацыі вынікала менавіта на падставе ўліковых складанасцей, калі кожны мікрафільм меў некалькі кодавых шыфраў. Пераводная табліца была складзена супрацоўнікам партархіва Г.Р. Бялькевічам. Сённяшні ўлік калекцыі мікрафільмаў у НА РБ вядзецца на аснове якраз новай нумарацыі, уведзенай пераводнай табліцай.

патрабаванняў можна прапанаваць наступны варыянт архіўнай спасылкі на мікрафільм, напрыклад: НА РБ. МФ 135. К. 00658 ці НА РБ. МФ 135 [Т-175, R-236]. К. 00658, аддаючы перавагу першаму варыянту.

Зараз паспрабуем даць агульную замалёўку зместу[*******] згаданага мікрафільма з улікам пошуку матэрыялаў непасрэдна па айчыннай гісторыі. Заўважым, што разглядаемая намі плёнка ўтрымлівае 39 штотыднёвых "сообщений", але толькі 31 з іх мае канкрэтныя ці ўскосныя звесткі пра падзеі, што адбываліся на тэрыторыі акупаванай Беларусі на працягу часу з 14 жніўня 1942 г. па 21 мая 1943 г.[15].

Паведамленні падаюцца ў строга зацверджанай форме, пачынаюцца анатаваным зместам, з якога можна даведацца пра асноўныя падзеі, з'явы, факты на працягу справаздачнага тыдня службы паліцыі і службы бяспекі, якія рэгулярна даводзілі інфармацыю да ведама вышэйшага камандавання (месцазнаходжанне – Берлін). Пры гэтым само паведамленне ўмоўна падзялялася на тры абавязковыя раздзелы, адпаведна: А – "Праціўнік і выканаўчыя пытанні", В – "Жыццёвая вобласць" і С – "Паведамленні з незанятай тэрыторыі СССР". У першым раздзеле часцей за ўсё сустракаецца інфармацыя адносна дзейнасці партызан, камуністычнага падполля, дыверсійных груп, а таксама розных актаў барацьбы супраць нямецкіх ваенных, паліцэйскіх і грамадзянскіх устаноў і г.д. Другі раздзел змяшчае матэрыялы пра агульнае становішча і настрой насельніцтва ў раёне тылавых частак арміі "Цэнтр", эканамічныя і гаспадарчыя пытанні, правядзенне аграрнай рэформы на тэрыторыі адміністрацыйнага і ваеннага кіравання, формаў кіравання на ўзроўні горада і раёна, стану прапаганды, выканання заданняў па адпраўцы насельніцтва на прымусовыя работы ў Германію і шмат іншага. Трэці раздзел утрымлівае крайне

---

******* Аўтар не можа не звярнуць увагу на важныя гістарычныя і тэхнічныя звесткі, якія ўтрымліваюць усе мікрафільмы. Напачатку кожнага роліка на двух кадрах непасрэдныя арганізатары і выканаўцы мікрафільмавання паслядоўна змяшчалі на англійскай мове інфармацыю пра Амерыканскую гістарычную асацыяцыю і рэгістрацыйныя даныя мікрафільма (Т-175, Roll 236). Затым прыводзіцца тытульны ліст, уверсе якога даецца адрасная спасылка на прыналежнасць дакументальных матэрыялаў. У нашым выпадку гэта: Рэйхсфюрэр СС і начальнік германскай паліцыі. У цэнтры падаецца наступны радок – "мікракопія № 175 Нацыянальнага архіва". Ніжэй зноў згадваецца пра Амерыканскую гістарычную асацыяцыю і Амерыканскі камітэт па вывучэнні дакументаў вайны. Апошні радок прысвечаны месцу і году стварэння мікрафільма. У дачыненні да разглядаемай стужкі – "Вашынгтон, 1958".

На наступнай старонцы прыводзіцца не менш цікавая інфармацыя, якая датычыцца дакументальнага зместу мікрафільма. Але верхнія радкі зноў займаюць афіцыйныя назвы Асацыяцыі і Камітэта, а таксама Нацыянальнага архіва і яго сервіснага Цэнтра. Крыху ніжэй пазначалася, што абзорная калекцыя прысвечана Другой сусветнай вайне, дакументальную аснову якой складаюць копіі арыгінальных матэрыялаў. Яны кампанаваліся ў адным серыяле, які атрымаў чарговы нумар 236. Сюды ўваходзілі кадры адпаведна з 2 724 696 па 2 725 982. Далей рабілася згадка пра форму працы над мікрафільмам, з якой вынікала, што ў яго былі ўключаны ўсе матэрыялы 4 папак, куды ўваходзяць "Данясенні з занятых усходніх тэрыторый пад нумарамі 1 – 55, што пабачылі свет на працягу перыяду з 1 мая 1942 г. да 21 мая 1943 г.". Прыведзеныя матэрыялы папярэднічалі серыі "Паведамленняў з СССР". Апошнім радком стаяла прозвішча выканаўцы і год. Гэта азначала, што чарговы 236 ролік быў створаны ў 1961 г.

малую інфармацыю, якая датычылася неакупаваных раёнаў СССР. Апрача гэтага ў некаторых паведамленнях можна сустрэць дадатковую інфармацыю, якая датычылася месцаў знаходжання, сродкаў ці формаў сувязі з службамі паліцыі і бяспекі ў Баранавічах, Віцебску, Гомелі, Магілёве, Мінску, Оршы, другіх гарадах Беларусі, і інш.

Нават кароткае знаёмства з матэрыяламі мікрафільма дае наглядное ўяўленне пра важнасць інфармацыі, якая захоўваецца на ім. Апрача таго, аналіз зместу дакументальнага матэрыялу, асабліва з пункта погляду яго адпаведнасці першакрыніцам, не пакідае пытанняў адносна неабходнасці больш сур'ёзнай апрацоўкі ўсёй калекцыі "александрыйскіх" мікрафільмаў. Патрэба ў гэтым дыктуецца пошукам новых падыходаў да гістарычнай праблематыкі, асабліва да падзей другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Такім чынам, перад беларускай гістарычнай навукай і айчыннай археаграфіяй *стаіць актуальная задача* навуковай апрацоўкі і выдання "александрыйскіх" мікрафільмаў.

---

[1] Гл. падрабязней: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1 – 5. Мн., 1993 – 1999; Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 1 – 8. Мн., 1996 – 1999; Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства: Зб. артыкулаў. Мн., 1999.

[2] Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны... С. 50.

[3] Документы по истории Великой Отечественной войны в государственных архивах Республики Беларусь. Аннотированный справочник // Авт.-сост.: С.В. Жумарь и др. – Мн., 1998. С. 229.

[4] На думку С.У. Жумара, "александрыйскія мікрафільмы" паступілі "из ЦПА ИМЛ при ЦК КПСС и Потсдамского архива (Германия)... в ПА ИИП при ЦК КПБ и ЦГАОР БССР в 1961 – 1983 гг." – *Гл. дакладней: Документы по истории Великой Отечественной войны... С. 169.*

Згаданыя гістарычныя даты, якія можна лічыць крайнімі пры камплектаванні айчыннай калекцыі мікрафільмаў, з'яўляюцца дакладнымі і на наш погляд. Але яны хутчэй маюць дачыненне не толькі да "александрыйскіх", колькі да ўсёй калекцыі мікрафільмаў НА РБ, пра што можна даведацца ў шостым раздзеле "Архивные коллекции" прыведзенага вышэй анатаванага даведніка, у якім яны падаюцца пад назвай "Коллекция микрофильмов, хранящихся в архивах зарубежных стран и ведомостных архивах Республики Беларусь, 369 ед. хр., 1939 – 1945".

Аднак у дачыненні да "александрыйскай" плёнкі існуюць і другія звесткі, якія, на нашу думку, таксама не з'яўляюцца канчатковымі і таму патрабуюць далейшага ўдакладнення. На падставе асабістага доследу нам вядома, што напрыканцы 1980 г. у бягучым архіве сектара гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ у наяўнасці было 279 мікрафільмаў з патсдамскай калекцыі, адкуль яны трапілі ў нашу краіну некалькімі шляхамі: першы – непасрэдна з патсдамскага архіва было перададзена 200 мікрафільмаў, другі – праз ЦДАКР (Цэнтральны дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі) УССР было перададзена 70 мікрафільмаў, трэці – 8 мікрафільмаў ахвяраваў архіў Міністэрства абароны СССР і адзін мікрафільм быў атрыманы з ЦПА ІМЛ пры ЦК КПСС.

Цікавай з'яўляецца і інфармацыя пра гісторыю камплектавання айчыннай калекцыі мікрафільмаў. Асаблівасці іх адбору, фармавання і камплектавання, а таксама збору архіўнага фонду ІГП пры ЦК КПБ за кошт паступленняў "патсдамскіх" мікрафільмаў сталі вядомы аўтару дзякуючы інфармацыі, якой шчыра падзяліўся прафесар У.К. Коршук. Камплектаванне адбывалася пры ўдзеле навукоўцаў і супрацоўнікаў інстытута – П.П. Ліпілы,

В.П. Раманоўскага і А.В. Сямёнавай, якія выязджалі ў Патсдам і вялі адбор мікрафільмаў з матэрыяламі, што ўтрымлівалі звесткі пра гісторыю Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі. У выніку на працягу 1970-х гг. была зкамплектавана айчынная калекцыя мікрафільмаў. Большая палова з іх (159) патрапіла ў бягучы фонд сектара гісторыі 24.01.1972, у якасці апошняй гістарычнай даты паступлення другой партыі матэрыялаў з Патсдама была дата – 24.12.1980.

[5] Гл. падрабязна: Gesamtprogramm und Neuerscheinungen 2. Halbjahr 1999 von Hamburger Edition. Institut für Sozialforschung, in: http://www.his-online.de

[6] Christian Gerlach. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999. S. 25. Нямецкі аўтар прыводзіць дакладныя даныя пра матэрыялы, якія непасрэдна выкарыстаны пры падрыхтоўцы свайго "манументальнага" выдання ў 1232 старонкі. З улікам згаданай тэматыкі гісторык адзначае, што сёння на ўзроўні Федэральнага архіва Германіі мікрафільмаваным з'яўляецца цэлы шэраг архіўных дакументаў, у тым ліку: справы і амаль цалкам захаваныя ваенныя дзённікі (у большасці сваёй з дадаткамі) галоўнага кіравання эканамічнага штаба Ost і яго розных структурных падраздзяленняў (галоўнай групы сельскай гаспадаркі, інспекцыі ўзбраення Ostland, ваеннай каманды Мінск і яе філіялаў, эканамічнай інспекцыі Mitte і інш. Практычна ўсе яны знаходзяцца ў Федэральным ваенным архіве ў Фрайбургу *(зямля Бадэн-Вюртэмберг. – С.Н.)*. Нямецкі даследчык адзначае, што 98 % цытаваных у якасці дакументальных крыніц выкарыстаных ім мікрафільмаў знаходзяцца ў Фрайбургу. Згадка "патсдамскага" мікрафільма прыводзіцца ў сувязі з тым, што да апошняга часу менавіта ў Патсдаме знаходзіўся ваенны архіў, які да аб'яднання Германіі ў 1989 г. выконваў вядучую ролю ў былой ГДР. Якраз на аснове паступленняў з патсдамскага архіва і была створана калекцыя мікрафільмаў спачатку ў Інстытуце гісторыі партыі, а потым у партархіве пры ЦК КПБ.

[7] Туронак Ю.Б. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Пер. з польскай В.Ждановіч. Каментарыі А.М. Літвіна. Мн., 1993. С. 9.

[8] Тамсама.

[9] НА РБ. МФ (Мікрафільмы: 74 – 328). Падлікі праведзены аўтарам на падставе ўліку 279 ролікаў з калекцыі "александрыйскіх" мікрафільмаў, якія захоўваюцца ў фондзе мікрафільмаў НА РБ. Пры гэтым аўтар пакінуў па-за межамі падліку мікрафільмы, якія з'яўляюцца дублікатамі некаторых мікрафільмаў агульнай колькасцю 22 816 кадраў ці ўліковых старонак. Таму іх агульная колькасць значна большая і складае 314 844 лісты, г.зн., што ў даследчыкаў ёсць падставы для знаёмства і вывучэння яшчэ 1000 умоўных архіўных спраў, якія маюць аднолькавую колькасць старонак (не больш за 314). Цікавым можа быць і такое параўнанне, як даўжыня ўсіх ролікаў плёнкі. Яна складае 6296 м ці больш за 6 км. Самым доўгім можна лічыць мікрафільм пад архіўным нумарам 79. Пры агульнай колькасці кадраў 1862 даўжыня мікрафільма перавышае 37 метраў, у той час як самым кароткім з'яўляецца плёнка даўжынёй у 52 кадры. Адзначым, што большасць плёнак (усяго 218) перавышае 1000 кадраў, г.зн. даўжэй за 20 метраў. Да тэхнічных згадак трэба аднесці і форму апрацоўкі самой стужкі, якая падзяляецца на негатывы і пазітывы. Прычым апошніх толькі 128.

[10] Падлікі аўтара.

[11] НА РБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 948. ЛЛ. 155, 156 – 165, 166 – 170, 171 – 172, 173 – 175.

[12] Параўнай: тамсама. Спр. 948. ЛЛ. 13 і 14, 41 і 42, 74 і 75, 91 і 93, 111 і 112, 121 і 122, 130 і 146.

[13] НА РБ. МФ 231. К. 00658. Гл. таксама: Новікаў С.Я. Падмурак навуковых гістарычных ведаў – гістарычныя крыніцы: знаёмства з новым архіўным дакументам // Вести ИСЗ. 1999. № 1. С. 52 – 58.

[14] Напрыклад: НА РБ, микрофильм Т-175, ролик 140, арх. № 121, к. 0668158, 0668159. Перевод с немецкого. // Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941 – 1944): Документы и материалы. В 2 кн. Кн. 1 (1941 – 1942) / Сост. Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко и др. – Мн., 1996. С. 208 ці: НАРБ, микрофильм, арх. № 233, к. 00041 – 00043. Перевод с немецкого // Тамсама. Кн. 2 (1943 – 1944). – Мн., 1997. С. 266.

[15] НА РБ. МФ 135. К. 2 724 696 – 2 725 982. Як бачна, стужка мае 1286 кадраў ці даўжыню, што адпавядае адрэзку ў 25,72 м. Непасрэдна Беларусі датычацца 125 кадраў ці амаль 9,7 % агульнай колькасці мікрафільма (падлікі аўтара).